**Дзмітры Кузьма**
(Мінск)

# Роля Супрасльскага духоўнага вучылішча і Літоўскай духоўнай семінарыі ў фарміраванні поглядаў Міхаіла Каяловіча

Вядомы царкоўны гісторык і грамадскі дзеяч другой паловы XIX ст. Міхаіл Восіпавіч Каяловіч атрымаў першапачатковую адукацыю ў Супраслі і Вільні. Успамінаючы тыя гады, вучоны адзначаў, што менавіта ў гэтых навучальных установах пад уплывам настаўнікаў і мітрапаліта Іосіфа Сямашкі ў яго ўзнікла цікавасць да гісторыі заходняга рэгіёна Расійскай імперыі і склалася сістэма поглядаў на мінулае і сучаснае гэтых тэрыторый.

У 1841 г. Міхаіл Восіпавіч Каяловіч паступіў вучыцца[1] ў Супрасльскае духоўнае вучылішча[2]. Гэтая адукацыйная ўстанова была адчынена ў 1834 г. у Супрасльскім манастыры, які быў абавязаны забяспечваць заробкам і харчаваннем настаўнікаў, а таксама ўтрымліваць 20 казённакоштных вучняў. У 1838/1839 навучальным годзе агульная колькасць навучэнцаў у прыходскім і духоўным Супрасльскіх вучылішчах складала 66 чалавек[3]. Духоўныя вучылішчы мелі адзін падрыхтоўчы і чатыры звычайныя класы, якія падзяляліся на два аддзяленні — ніжэйшае і вышэйшае, па два гады кожнае[4]. Вучэбная праграма ўключала як багаслоўскія, так і свецкія (у аб’ёме трох малодшых класаў класічнай гімназіі) прадметы[5]. Гэтыя ўстановы падпарадкоўваліся мясцовым семінарскім праўленням, а непасрэдна арганізоўваў і кіраваў навучальным працэсам спецыяльна прызначаны наглядчык. У вучылішчы бясплатна атрымоўвалі адукацыю дзеці праваслаўных духоўных асоб, выхадцы з іншых саслоўяў павінны былі плаціць за навучанне.

Захаваліся цікавыя ўспаміны самога Міхаіла Восіпавіча аб часах вучобы ў мястэчку Супрасль. Гісторык пісаў, што ў Супрасльскім вучы-

[1] Існуюць разыходжанні адносна даты паступлення М. Каяловіча ў духоўнае вучылішча. В. Чарапіца лічыць, што гэта адбылося ў 1839 г., а ў некралогу І. Катовіча фігуруе 1841 г. Апошняя дата падаецца нам больш рэалістычнай, улічваючы, што навучанне ў гэтай установе працягвалася не 6, а толькі 4-5 гадоў.

[2] И. Котович, *Некролог. М. О. Коялович*, „Литовские епархиальные ведомости”, 1891, № 35, с. 278.

[3] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии*, Вильно 1892, с. 145.

[4] С. В. Восович, *Учебные заведения православного духовного ведомства в Беларуси. Конец XVIII века — 1914 г.*, дис. канд. ист. наук, Минск 2003, л. 30.

[5] Д. Гусаков, *Гомельское Духовное училище*, [на сайце:] http://nashkraj.info/content/view/30/49.

лішчы, у якім ён пачаў сваю адукацыю, у тыя часы захоўвалася „цудоўнае правіла” Жыровіцкай семінарыі, згодна якому выкладчыкі павінны былі быць асабліва добра адукаванымі[6]. У перыяд вучобы М. Каяловіча ў гэтай навучальнай установе працавалі тры настаўнікі з акадэмічнай адукацыяй. На той час гэта была досыць рэдкая і ўнікальная з'ява. Вучоны сцвярджаў, што „такой раскошы” не мелі многія павятовыя вучылішчы нават нашмат пазней, у канцы 1860-х гадоў[7].

У 1843 г. адбылася рэвізія Супрасльскага духоўнага вучылішча, якую праводзіў выкладчык Жыровіцкай духоўнай семінарыі, прафесар Пракопій Нілавіч Дабрахотаў[8]. Праверцы падвергся ўзровень навуковай падрыхтоўкі і стан матэрыяльнай базы гэтай навучальнай установы. Так, рэвізор адзначаў досыць высокі ўзровень ведаў па свяшчэннай гісторыі, веданню катэхізісу і рускай мове сярод вучняў ніжэйшага аддзялення: Міхаіла Каяловіча, Клімента Смольскага і Аляксандра Тарановіча. Але пры гэтым П. Дабрахотаў вымушаны быў звярнуць увагу на беднасць бібліятэкі і недахоп такіх патрэбных рэчаў, як добрае адзенне і пасцельная бялізна. Па выніках праверкі быў звольнены інспектар вучылішча[9].

Успамінаючы аб гадах сваёй маладосці, Міхаіл Каяловіч пісаў, што духоўныя навучальныя ўстановы таго часу не мелі абмежаванняў пры прыёме дзяцей з іншых саслоўяў. Вучоны адзначаў, што падчас вучобы (хутчэй за ўсё ён меў на ўвазе Супрасльскае духоўнае вучылішча — Д. К.) сярод яго сяброў быў сын аднаго небагатага пана, і нават адзін немец. Гэтыя вучні атрымоўвалі адукацыю і зусім не збіраліся пераходзіць у праваслаўнае духоўнае саслоўе. Яны абодва захоўвалі сваё веравызнанне, адзін — лацінскае, а другі — пратэстанцкае. Падобныя ж з'явы мелі месца і ў іншых духоўных навучальных установах рэгіёна. Пры гэтым М. Каяловіч выступаў супраць саслоўных абмежаванняў пры атрыманні адукацыі. Ён пісаў, што гэта зусім новая з'ява і выказваў пажаданне, каб яна была непрацяглай[10].

З 1845 г. Міхаіл Восіпавіч вучыўся ў Літоўскай духоўнай семінарыі. Якраз у гэты ж самы год яна была толькі пераведзена з Жыровіч у Вільню[11]. Семінарыя карысталася асаблівай увагай з боку архіепіскапа Іосіфа Сямашкі. Навучальны ўзровень гэтай адукацыйнай установы быў досыць высокім. Міхаіл Каяловіч успамінаў, што ў „Віленскай семіна-

[6] М. Коялович, *О заслугах покойного митрополита литовского Иосифа в деле русского образования в западной России*, „Журнал Министерства Народного Просвещения”, 1868, № 140, с. 901.

[7] Там жа, с. 901.

[8] *Павел (Доброхотов). Биография*, [на сайце:] http://ortho-rus.ru/cgi-bin/ps_file.cgi?2_1850.

[9] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 147.

[10] М. Коялович, *О заслугах...*, с. 903.

[11] И. Котович, *Некролог. М. О. Коялович...*, с. 278.

рыі" падчас яго вучобы сярод настаўнікаў было пяць магістраў „з лепшых выхаванцаў" Пецярбургскай, Маскоўскай і Кіеўскай духоўных акадэмій. Гісторык адзначаў, што „такой раскошы не ведалі і пазней многія семінарыі"[12]. Двое з гэтых магістраў, паходзячыя з унутраных губерняў Расіі, грунтоўна займаліся „заходнярускай" гісторыяй. М. Каяловіч з глыбокай удзячнасцю ўспамінаў значны ўплыў гэтых асоб на сваё станаўленне ў якасці гісторыка. Прычым вучоны адзначаў наяўнасць пэўных адрозненняў паміж духоўнымі навучальнымі ўстановамі заходніх і цэнтральных губерняў імперыі. У прыватнасці, Міхаіл Восіпавіч указваў, што звесткі, якія падаваў у сваіх успамінах аб пецярбургскіх духоўным вучылішчы і семінарыі Мікалай Памялоўскі[13], былі для яго і „без сумнення для ўсіх нашых таварышаў па выхаванні ў Заходняй Расіі такой жа дзіўнай навіной, як і для свецкіх людзей, зусім не знаёмых з духоўнымі ўстановамі ўнутраных губерняў Расіі"[14].

Кіраваў Літоўскай духоўнай семінарыяй у другой палове 1840-х гадоў архімандрыт Яўсевій Ільінскі. Ён нарадзіўся ў Курскай губерні, атрымаў ступень магістра ў Кіеўскай духоўнай акадэміі ў 1835 г., працаваў у 1839-1845 гг. рэктарам Кіеўскай духоўнай семінарыі і настаяцелем Кіева-Мікалаева манастыра. З 1845 па 1849 гады Я. Ільінскі быў рэктарам Літоўскай духоўнай семінарыі і настаяцелем Свята-Троіцкага трэцякласнага манастыра ў Вільні. Аб архімандрыце захаваліся звесткі, што гэта быў строгі, але пры гэтым вельмі справядлівы кіраўнік, які меў моцны пазітыўны ўплыў на навучэнцаў[15]. Да нашага часу дайшла цікавая інфармацыя аб выкладчыках, якія працавалі ў семінарыі падчас вучобы М. Каяловіча. Грэчаскую і яўрэйскую мовы, свяшчэннае пісанне выкладаў прафесар Іван Іванавіч Юркевіч, які сам паходзіў з Мінскай губерні[16]. Выпускнік Пецярбургскай духоўнай акадэміі Іосіф Андрэевіч Шэмяціла, ураджэнец Кобрынскага павета, памочнік рэктара, працаваў з семінарыстамі над вучэннем аб веравызнаннях, маральным і пастырскім багаслоўем, царкоўным красамоўствам і французскай мовай[17]. Васіль Уладзіслаўлеў, магістр багаслоўя Маскоўскай духоўнай акадэміі, паходзячы з Цвярской губерні, у 1846-1847 гг. чытаў усеагульную і рускую гісторыю, грэчаскую мову. Пасля яго ў 1847-1862 гг. гэтыя ж прадметы вык-

[12] М. Коялович, *О заслугах...*, с. 901.
[13] Н. Помяловский, *Очерки бурсы* [на сайце:] http://miroslavie.ru/library/pm/bursa.html.
[14] М. Коялович, *О заслугах...*, с. 901.
[15] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 170.
[16] *Список начальствующих, преподавателей и других лиц, служивших в Литовской Духовной Семинарии в 1828 г.*, [на сайце:] http://www.petergen.com/bovkalo/pr/litwaprp.html.
[17] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 177.

ладаў Восіп Паўлавіч Дзем'яновіч, кандыдат багаслоўя Пецярбургскай духоўнай акадэміі, які нарадзіўся ў Магілёўскай губерні. Вучыў студэнтаў правільнаму вядзенню сельскай гаспадаркі Аляксандр Малчанаў, прысланы з Санкт-Пецярбургскай губерні. Ураджэнец Віленшчыны Пётр Іосіфавіч Ранчэўскі выкладаў фізіка-матэматычныя прадметы, а таксама сельскую гаспадарку. З 1837 г. вёў заняткі па біблейскай гісторыі, усеагульнай царкоўнай і грамадзянскай рускай гісторыі, абраднасці (обрядословие), кананічным праве і грэчаскай мове, да 1849 г. выконваў абавязкі загадчыка семінарскай бібліятэкі Пракопій Нілавіч Дабрахотаў, у манастве — айцец Павел[18]. Пазней ён стаў епіскапам Пскоўскім і Пархоўскім[19]. З 1849 па 1862 гады працаваў у семінарыі магістр багаслоўя Канстанцін Іванавіч Снітко, ураджэнец Віленскай губерні. Яшчэ ў 1844 г. яго, як аднаго з лепшых выпускнікоў Літоўскай духоўнай семінарыі, адправілі працягваць навучанне ў Маскоўскую духоўную акадэмію. Пасля заканчэння гэтай адукацыйнай установы, ён у 1848 г. працаваў у Чарнігаўскай семінарыі, а потым — у Літоўскай[20]. К. Снітко выкладаў кананічнае права, усеагульную і рускую гісторыю, біблейскую гісторыю, быў бібліятэкарам. У 1862 г. Канстанцін Снітко перайшоў на службу ў Міністэрства народнай асветы[21].

Неабходна адзначыць, што існавала практыка кожныя два гады адпраўляць для працягу вучобы па некалькі лепшых выпускнікоў Літоўскай духоўнай семінарыі ў Пецярбургскую ці, радзей, у Маскоўскую і Кіеўскую духоўныя акадэміі[22]. Так, Іаанн Катовіч адзначаў, што аднымі з першых у 1842 г. былі накіраваны атрымоўваць вышэйшую духоўную адукацыю ў Санкт-Пецярбург такія добра падрыхтаваныя навучэнцы, як Ксенафонт Гаворскі, які пасля стаў выдаўцом і рэдактарам „Весніка Заходняй і Паўднёва-Заходняй Расіі" і Фелікс Лукашэвіч. Даследчык прама пісаў: „Вопыт быў настолькі ўдалым, што з тых часоў думка аб Полацкай духоўнай акадэміі страціла моц і пачаўся бесперапынны шэраг адпраўленняў студэнтаў у вышэйшыя духоўныя і нават свецкія навучальныя ўстановы"[23]. У самой жа семінарыі часта працавалі былыя яе выпускнікі. Напрыклад, І. Юркевіч, І. Шэмяціла, К. Снітко

[18] А. Кароль, *Літоўская духоўная семінарыя,* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т.*, т. 4, Мінск 1997, с. 384.

[19] *Павел (Доброхотов). Биография*, [на сайце:] http://ortho-rus.ru/cgi-bin/ps_file.cgi?2_1850.

[20] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 179-181.

[21] И. Котович, *Историческая записка, читанная на акте в день юбилея*, [у:] *Пятидесятилетний юбилей православной Литовской духовной семинарии*, Вильна 1878, с. 99.

[22] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 79.

[23] И. Котович, *Историческая записка...*, с. 76.

скончылі Літоўскую духоўную семінарыю, і пасля атрымання вышэйшай адукацыі вярнуліся выкладаць у гэтую ўстанову[24]. У 1862 г. частка выкладчыкаў семінарыі перайшла ў свецкія ўстановы адукацыі. Гэта было звязана з павелічэннем колькасці школ, якія падпарадкоўваліся Міністэрству народнай асветы, і недахопам настаўніцкіх і кіраўніцкіх кадраў. Да таго ж узровень аплаты працы ў свецкіх навучальных установах быў нашмат вышэйшым, чым у духоўных. Напрыклад, Канстанцін Іванавіч Снітко стаў дырэктарам народных школ Віленскай губерні, а Восіп Паўлавіч Дзем'яновіч кіраваў народнымі вучылішчамі Гродзенскай губерні[25].

Захаваліся цікавыя звесткі аб Міхаіле Каяловічу ў час яго навучання ў семінарыі. Пра будучага гісторыка пісалі, што для яго быў характэрны добры нораў, узорная руплівасць і старанная дакладнасць пры выкананні сваіх вучнёўскіх абавязкаў[26]. Вучоба ў семінарыі цягнулася 6 гадоў і складалася з трох аддзяленняў: ніжэйшага, сярэдняга і вышэйшага, кожнае з якіх прадугледжвала падрыхтоўку на працягу двух гадоў. Варта адзначыць насычанасць вучэбнай праграмы семінарыі. Вучні павінны былі кожны месяц пісаць ад двух да чатырох (у залежнасці ад аддзялення) сачыненняў[27]. Навучальных дапаможнікаў не хапала, а для выкладання, напрыклад, рускай грамадзянскай гісторыі выкарыстоўваўся шырока распаўсюджаны ў тыя часы ў навучальных установах Расійскай імперыі падручнік Мікалая Устралава[28]. Пра асобнае выкладанне гісторыі заходняга краю гаворка не ішла. Па сведчаннях сучаснікаў, вучэбны працэс у Літоўскай духоўнай семінарыі падчас дзеяння Статуту 1840 г. знаходзіўся на досыць высокім узроўні. З усіх прадметаў семінарскага курсу з лепшымі вынікамі вывучаліся багаслоўскія і царкоўна-гістарычныя навукі. Настаўнікі, выкладаўшыя гэтыя дысцыпліны, два разы атрымоўвалі падзякі ад акадэмічнага кіраўніцтва за грунтоўную падрыхтоўку семінарыстаў да паступлення ў акадэмію[29]. Агульная колькасць навучэнцаў складала ў 1846 г. 177 чалавек, з якіх 167 вучыліся бясплатна, а 10 самастойна аплачвалі сваю вучобу[30]. Пры Літоўскай семінарыі да 1848 г. існаваў этнаграфічны камітэт, які здолеў сабраць шэраг цікавых краязнаўчых матэрыялаў[31]. М. Каяловіч мог быць не толькі знаёмым з вынікамі даследаванняў гэтага аб'яднання,

[24] *Список начальствующих, преподавателей и других лиц...*, [на сайце: ] http://www.petergen.com/bovkalo/pr/litwaprp.html.
[25] И. Котович, *Историческая записка...*, с. 99.
[26] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 83.
[27] Там жа, с. 203.
[28] Там жа, с. 192.
[29] Там жа, с. 202.
[30] Там жа, с. 227.
[31] С. В. Восович, *Учебные заведения...*, л. 101.

але і прымаць непасрэдны ўдзел у яго працы.

У 1850 г. семінарыю наведаў імператар Мікалай I[32]. Гэта было значнай падзеяй для навучальнай установы, аб якой пазней успаміналі на працягу многіх гадоў.

Варта адзначыць адну з асаблівасцей Літоўскай духоўнай семінарыі. Па асобым распараджэнні епархіяльнага і вучылішчнага кіраўніцтва, навучэнцам усіх аддзяленняў выкладалася нотная грамата і царкоўныя спевы. Указвалася, што з'яўленне такіх заняткаў было заснавана на жаданні задаволіць мясцовыя патрэбы. Семінарысты павінны былі вывучаць гэтыя прадметы ў свабодныя ад іншых дысцыплін гадзіны, а менавіта: у 3 ці 4 гадзіны пасля абеду па чацвяргах і суботах. Юнакі з вышэйшага аддзялення ў 1847/1848 вучэбным годзе развучвалі паніхіду, чын пахавання, пракімены, ірмасы тыдня Ваій, перадвелікоднай Суботы, каноны святога Вялікадня, Узнясення і Тройцы. У тым жа годзе ў сярэднім аддзяленні, дзе павінен быў працягваць вучобу Міхаіл Каяловіч, працавалі з ірмасамі Богаяўлення, Грамніцаў, тыдня Ваій, перадвелікоднай Суботы, Вялікадня і паўтаралі ірмасы ўсіх гласаў. Настаўнікам спеваў у той час працаваў протадыякан Паўловіч[33]. Семінарысты дабіваліся поспехаў у вывучэнні гэтай дысцыпліны. Да таго ж і сам мітрапаліт Іосіф, як аматар і знаўца царкоўных спеваў, звяртаў асаблівую ўвагу на засвойванне гэтага прадмета. Тых семінарыстаў, якія не праяўлялі патрэбнай стараннасці ў вывучэнні гэтай дысцыпліны, па яго загадзе пазбаўлялі казённага ўтрымання, як няздольных у будучым быць добрымі святарамі[34].

Іосіф Сямашка ўдзяляў шмат увагі пашырэнню духоўнай асветы ў рэгіёне і развіццю Літоўскай духоўнай семінарыі. Яшчэ падчас уласнай вучобы ў галоўнай семінарыі, існаваўшай пры Віленскім універсітэце, які кіраваўся „лепшымі сіламі партыі Чартарыйскага", будучы мітрапаліт зразумеў, якую значную ролю ў працэсе станаўлення асобы адыгрывае адукацыя. У сваіх успамінах аб Іосіфе Сямашку М. Каяловіч адзначаў: „Трэба было мець вялікую трываласць рускай народнасці, і вялікую сілу розуму, каб зразумець унутраную няпраўду гэтай раскошнай па знешнасці асветы Віленскага ўніверсітэта, і не пасці ў ім падобна многім другім уніятам-беларусам і маларосам"[35]. Пазней І. Сямашка добра пазнаёміўся з усімі тагачаснымі навучальнымі ўстановамі заходніх губерняў, якія, як пісаў Міхаіл Восіпавіч, усе зверху да нізу былі польскімі лацінскімі вучылішчамі і „рускі элемент" у іх быў амаль

[32] И. Котович, *Историческая записка...*, с. 109.

[33] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 202.

[34] Там жа, с. 202.

[35] М. Коялович, *О почившем митрополите литовском Иосифе*, Санкт-Петербург 1869, с. 2.

не знаёмы[36]. Імкнучыся змяніць сітуацыю, у 1828 г. мітрапаліт Іосіф заснаваў семінарыю ў Жыровічах у памяшканнях Свята-Успенскага манастыра. Яна павінна была дапамагчы аслабіць польскі і каталіцкі ўплыў на ўніяцкіх, а пазней — праваслаўных бацюшкаў. Аб ролі святароў у жыцці рэгіёна можна атрымаць прадстаўленне па ўспамінах М. Каяловіча, які пісаў, што духавенства „Заходняй Расіі" і ў 1860-я гады амаль адзінае складала „рускую інтэлігенцыю краіны, а тым больш яно было такім у часы ўз'яднання ўніятаў"[37]. Такім чынам, Жыровіцкая семінарыя ў беларускім рэгіёне выконвала больш значную ролю, чым проста спецыялізаваная саслоўная ўстанова, якая магла мець пэўнае значэнне толькі ў коле духавенства. Як адно з важнейшых дасягненняў мітрапаліта Іосіфа Міхаіл Каяловіч адзначаў выхоўванне „вакол сябе" досыць значнай колькасці паслядоўнікаў. Гісторык пісаў, што ён сам добра памятаў надзвычайнае абаянне педагагічнай сілы гэтай асобы[38]. Напрыклад, іерарх часта наведваў па вечарах Літоўскую духоўную семінарыю. Ён сядаў на вучнёўскае крэсла ў вучэбным пакоі і вёў размовы з семінарыстамі. Падчас гутаркі выяўлялася, што мітрапаліт ведаў родных амаль кожнага з навучэнцаў, іх сямейнае становішча і хатнія ўмовы. У гэтым не было нічога дзіўнага, улічваючы, колькі часу і сіл аддаў Іосіф Сямашка ўз'яднанню ўніятаў. Ён сам шмат разоў аб'язджаў уніяцкіх святароў Літоўскай епархіі, пераконваючы іх далучыцца да праваслаўя, да таго ж з 1834 г. бацюшкаў выклікалі ў Літоўскую духоўную семінарыю ў Жыровічы на трохтыднёвыя курсы для навучання чытанню, спевам і праваслаўным абрадам[39]. Падчас гэтых мерапрыемстваў мітрапаліт мог добра вывучыць умовы жыцця і асаблівасці характараў мясцовага духавенства, а пазней, дзякуючы добрай памяці, абмеркаваць гэта з іх падрослымі дзецьмі. Такі падыход вельмі моцна ўздзейнічаў на семінарыстаў. Міхаіл Восіпавіч, успамінаючы ўласныя адчуванні ад такой сустрэчы з іерархам пісаў: „У адно імгненне ён пераносіў хлопчыка, седзячага за кнігай у семінарыі далёка ад дому, у гэты самы дом, у кола яго родных, у кола яго інтарэсаў і паўсюль адкрываў перад гэтым хлопчыкам ідэал ведаў, служэння справе. Сям'я, радзіма, навука, вялікая будучыня зліваліся тут у адзіны вобраз, захопліваючы любую хоць крыху жывую душу"[40]. Падобныя ж успаміны аб Іосіфе Сямашку пакінуў і Іаанн Катовіч, які пісаў, што, пакуль

[36] М. Коялович, *О заслугах...*, с. 897.

[37] Там жа, с. 902.

[38] М. Коялович, *О почившем...*, с. 47.

[39] М. Носко, *Литовская Духовная Семинария и её роль в воссоединении униатов с Православной Церковью* [на сайце:] http://www. minds.by/stupeny/nomera/2/st2_7.html.

[40] М. Коялович, *О почившем...*, с. 46-47.

дазваляла здароўе, мітрапаліт часта наведваў семінарыю як па вечарах, так і падчас урокаў, і пакідаў моцнае ўражанне сваімі адносінамі да выхаванцаў і іх побыту. Акрамя таго, трацічныя і гадавыя экзамены амаль заўсёды праходзілі ў яго прысутнасці[41]. Мітрапаліт вельмі высока цаніў поспехі ў вучобе. Найбольш здольныя семінарысты прыцягвалі яго ўвагу як у перыяд навучання, так і пазней. Падчас святарскай працы яны маглі разлічваць на добрыя адносіны да сябе з боку іерарха. Тыя навучэнцы, якім пашчасціла заслужыць прыхільнасць гэтай асобы, заўсёды мелі з яго боку падтрымку, абарону і апякунства[42]. Дзякуючы самаадданай працы, скіраванай на дапамогу як праваслаўным, так і каталіцкім жыхарам рэгіёна, мітрапаліт набыў значны аўтарытэт і ўплыў таксама сярод свецкага насельніцтва. М. Каяловіч указваў, што ў „Заходняй Расіі" не было чалавека, які быў бы больш пастаянным і цвёрдым у перакананнях, чым мітрапаліт Іосіф[43].

Міхаіл Восіпавіч скончыў навучанне ў Літоўскай духоўнай семінарыі ў 1851 г. У агульным спісе выпускнікоў яго прозвішча знаходзілася на першым месцы ў першым разрадзе. Пасля яго, у адпаведнасці з паспяховасцю, былі пазначаны: Андронік Плаўскі, які ў манастве атрымаў імя Афанасій, Іван Грыгаровіч, Канстанцін Любінскі і іншыя[44]. М. Каяловіч і А. Плаўскі былі накіраваны працягваць сваю вучобу ў Пецярбургскую духоўную акадэмію. Гісторык Валеры Чарапіца адзначаў, што падчас знаходжання ў семінарыі паміж Міхаілам Каяловічам і Іванам Грыгаровічам мела месца своеасаблівае спаборніцтва за званне лепшага семінарыста (гэта быў аднафамілец вядомага археографа Івана Грыгаровіча — Д. К.). І толькі з-за просьбы бацькі да мітрапаліта І. Сямашкі, І. Грыгаровіча накіравалі на святарскую працу, а не ў духоўную акадэмію[45]. Перад гэтым у 1849 г. для працягу вучобы ў Пецярбургу быў адпраўлены Стэфан Грыгаровіч, верагодна, родны брат Івана Грыгаровіча[46]. Сям'і небагатага святара было б досыць складана забяспечыць вучобу ўсіх сыноў у Санкт-Пецярбургу, да таго ж, хутчэй за ўсё, патрэбны быў памочнік і па працы ў прыходзе.

Аб тым, наколькі яркай і неардынарнай асобай быў М. Каяловіч, можна меркаваць па некалькіх фактах. Па-першае, яго імя пастаянна ўпаміналі ў ліку найлепшых выпускнікоў Літоўскай духоўнай семінарыі. Ды і сам ён на ўсё жыццё захаваў вельмі цёплыя ўспаміны аб гэтай

[41] И. Котович, *Историческая записка...*, с. 99.
[42] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 168.
[43] М. Коялович, *О почившем...*, с. 47.
[44] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 557.
[45] В. Н. Черепица, *Михаил Осипович Коялович. История жизни и творчества*, Гродно 1998, с. 18.
[46] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 557.

навучальнай установе, і калі ў 1878 г. святкавалі пяцідзесяцігоддзе з моманту заснавання семінарыі, вучоны прасіў прабачэння, што не мог прыехаць на ўрачыстасць з-за моцнай загружанасці і праблем са здароўем. Але гісторык прыслаў на імя рэктара віншаванні для семінарыі. Ён пісаў, што ў думках будзе прысутнічаць на гэтай „дарагой урачыстасці" і жадаў Літоўскай духоўнай семінарыі вялікіх поспехаў, асабліва ў справе „таго сардэчнага служэння вышэйшым інтарэсам радзімы, якое так часта адрознівала заходнярускіх людзей"[47]. Акрамя таго, у самой семінарыі ў якасці навучальных дапаможнікаў нараўне з творамі праасвяшчэнных Філарэта (Драздова) і Макарыя (Булгакава) выкарыстоўваліся кнігі і часопісныя артыкулы прафесара М. Каяловіча, прысвечаныя ўніі[48]. Таксама працы Міхаіла Восіпавіча ляглі ў аснову складання курса па гісторыі славянскіх цэркваў[49].

У Літоўскай духоўнай семінарыі на працягу 1851-1857 гг. вучыўся родны брат гісторыка Іосіф Восіпавіч Каяловіч. Яго прозвішча стаяла чацвёртым па паспяховасці сярод выпускнікоў першага разрада 1857 г.[50]

Такім чынам, можна адзначыць, што вучоба ў духоўным вучылішчы і семінарыі грунтоўна паўплывалі на Міхаіла Восіпавіча Каяловіча. Яго прафесійныя навыкі, сістэма перакананняў склаліся якраз у гэты час. З другога боку, навучальныя ўстановы, якія ён скончыў, дзякуючы вялікай увазе з боку мітрапаліта Іосіфа, у гэты перыяд знаходзіліся на досыць высокім педагагічным і навуковым узроўні. Гэта спрыяла фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі і развіццю прафесійных якасцей будучага гісторыка. Падчас вучобы ў Літоўскай духоўнай семінарыі значны ўплыў на М. Каяловіча меў Іосіф Сямашка. Гэты чалавек імкнуўся прывіць семінарыстам сваю сістэму поглядаў на канфесійныя і нацыянальныя адносіны ў рэгіёне. Міхаіл Каяловіч стаў адным з лепшых яго вучняў і працяглы час захоўваў цёплыя адносіны з гэтым царкоўным іерархам, а пасля смерці Іосіфа ў 1868 г. імкнуўся даць грунтоўную і пазітыўную адзнаку ролі гэтай асобы ў гісторыі беларускіх зямель.

**Dzmitry Kuźma** — aspirant w Katedrze Dziedzictwa Historyczno-Kulturalnego Białorusi Republikańskiego Instytutu Szkoły Wyższej w Mińsku.

[47] М. Коялович, *Письмо ординарного профессора Санкт-Петербургской духовной семинарии М. Кояловича на имя отца ректора семинарии*, [у:] *Пятидесятилетний юбилей православной Литовской духовной семинарии*, Вильна 1878, с. 141-142.

[48] Н. Извеков, *История Литовской духовной семинарии...*, с. 331.

[49] Там жа, с. 316.

[50] *Выпускники Литовской духовной семинарии*, [на сайце: ] http://www.petergen.com/bovkalo/duhov/litsem.html.